6 05 Y 7/1939

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!



4

ОБ... КОНТ... ЭКЗ... ЫЙ ...ЯР

Работніца і калгасніца Беларусі

№ 21.

ЗАКОН

Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік са з'яднаннем яе з Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, заслухаўшы заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, **пастанаўляе:**

1. Задаволіць просьбу Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і ўключыць Заходнюю Беларусь у састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік са з'яднаннем яе з Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

2. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета назначыць дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Заходняй Беларусі.

3. Прапанаваць Вярхоўнаму Совету Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

4. Прасіць Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прадставіць на разгляд Вярхоўнага Совета СССР праект разгранічэння раёнаў і абласцей паміж Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 2 лістапада 1939 года.

ЗАКОН

аб прыняцці Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі

Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, заслухаўшы заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, **пастанаўляе:**

1. Вітаць усямерна гістарычную пастанову Вярхоўнага Совета СССР ад 2-га лістапада 1939 года аб уключэнні Заходняй Беларусі ў састаў Совецкага Саюза.

2. Прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і з'яднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзінай беларускай дзяржаве.

3. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета назначыць дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР ад Заходняй Беларусі.

4. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета БССР вызначыць адміністратыўнае дзяленне абласцей і раёнаў Заходняй Беларусі і, у адпаведнасці з пунктам „б" артыкула 19 Канстытуцыі БССР, прадставіць на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета СССР праект аб утварэнні новых абласцей і праект размежавання раёнаў і абласцей паміж Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

14 лістапада 1939 г.
г. Мінск.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б № 21. ЛІСТАПАД 1939 г.

На вокладцы: Дэпутат Народнага Сабрання Заходняй Беларусі гор. Беластока Марыя Іванаўна Дьячук— работніца тэкстыльнай фабрыкі. Фота Казловіча



Аб знешняй палітыцы Совецкага Саюза

Даклад Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. МОЛАТАВА на паседжанні Вярхоўнага Совета СССР 31 кастрычніка 1939 г.

Таварышы дэпутаты!

За апошнія два месяцы ў міжнароднай абстаноўцы адбыліся важныя змяненні. Гэта адносіцца, перш за ўсё, да становішча ў Еўропе, але таксама і да краін, якія знаходзяцца далёка за прэдзеламі Еўропы. У сувязі з гэтым трэба ўказаць на тры асноўныя акалічнасці, якія маюць рашаючае значэнне.

Па-першае, трэба ўказаць на змяненні, якія адбыліся ў адносінах паміж Совецкім Саюзам і Германіяй. З часу заключэння 23 жніўня совецка-германскага дагавора аб ненападзе быў пакладзен канец ненармальным адносінам, існаваўшым на працягу раду год паміж Совецкім Саюзам і Германіяй. На змену варожасці, усяляк падагравaўшайся з боку некаторых еўрапейскіх дзяржаў, прышло збліжэнне і ўстанаўленне дружаственых адносін паміж СССР і Германіяй. Далейшае паляпшэнне гэтых новых, добрых адносін знайшло сваё выражэнне ў германа-совецкім дагаворы аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй, падпісаным 28 верасня ў Маскве. Круты паварот, які адбыўся ў адносінах паміж Совецкім Саюзам і Германіяй, паміж двума самымі буйнымі дзяржавамі Еўропы, не мог не сказацца на ўсім міжнародным становішчы. Пры гэтым падзеі цалкам пацвердзілі тую ацэнку палітычнага значэння совецка-германскага збліжэння, якая была дана на мінулай Сесіі Вярхоўнага Совета.

Па-другое, трэба ўказаць на такі факт, як ваенны разгром Польшчы і распад польскай дзяржавы. Правячыя кругі Польшчы не мала кічыліся «моцнасцю» сваёй дзяржавы і «магутнасцю» сваёй арміі. Аднак, аказалася дастатковым кароткага ўдару па Польшчы з боку спачатку германскай арміі, а затым—Чырвонай Арміі, каб нічога не асталося ад гэтага ўродлівага дзецішча версальскага дагавора, жыўшага за кошт прыгнечання няпольскіх нацыянальнасцей. «Традыцыйная палітыка» беспрынцыпнага лавіравання і ігры паміж Германіяй і СССР аказалася несастаяцельнай і поўнасцю абанкрацілася.

Па-трэцяе, трэба прызнаць, што выбухнуўшая ў Еўропе вялікая вайна ўнесла карэнныя змяненні ва ўсю міжнародную абстаноўку. Гэтая вайна пачалася паміж Германіяй і Польшчай і ператварылася ў вайну паміж Германіяй—з аднаго боку, Англіяй і Францыяй—з другога боку.

Дзяржаўная бібліятэка імені ЛЕНІНА 1

Вайна паміж Германіяй і Польшчай закончылася быстра, з прычыны поўнага банкроцтва польскіх кіраўнікоў. Польшчы, як вядома, не дапамаглі ні англійскія, ні французскія гарантыі. Да гэтага часу, уласна, так і невядома, што гэта былі за «гарантыі» **(Агульны смех).** Пачаўшаяся паміж Германіяй і англа-французскім блокам вайна знаходзіцца толькі ў сваёй першай стадыі і па-сапраўднаму яшчэ не разгарнулася. Тым не менш, зразумела, што такая вайна павінна была ўнесці карэнныя змяненні ў становішча Еўропы, ды і не толькі Еўропы.

У сувязі з гэтымі важнымі зменамі міжнароднай абстаноўкі, некаторыя старыя формулы, якімі мы карысталіся яшчэ нядаўна,—і да якіх многія так прывыклі—яўна ўстарэлі і цяпер непрымянімы. Трэба аддаць сабе ў гэтым адчот, каб унікнуць грубых памылак у ацэнцы склаўшагася новага палітычнага становішча ў Еўропе.

Вядома, напрыклад, што за апошнія некалькі месяцаў такія паняцці, як «агрэсія», «агрэсар» атрымалі новы канкрэтны змест, набылі новы сэнс. Не цяжка здагадацца, што цяпер мы не можам карыстацца гэтымі паняццямі ў тым-жа сэнсе, як, скажам, 3—4 месяцы таму назад. Цяпер, калі гаварыць аб вялікіх дзяржавах Еўропы, Германія знаходзіцца ў становішчы дзяржавы, якая імкнецца да хутчэйшага сканчэння вайны і да міру, а Англія і Францыя, учора яшчэ ратаваўшыя супроць агрэсіі, стаяць за працяг вайны і супроць заключэння міру. Ролі, як бачыце, мяняюцца.

Спробы англійскага і французскага ўрадаў апраўдаць гэтую сваю новую пазіцыю данымі Польшчы абавязацельствамі, зразумела, яўна несастаяцельны. Аб аднаўленні старай Польшчы, як кожнаму зразумела, не можа быць і гутаркі. Таму бессэнсоўным з'яўляецца працяг цяперашняй вайны пад сцягам аднаўлення ранейшай польскай дзяржавы. Разумеючы гэта, урады Англіі і Францыі, аднак, не хочуць спынення вайны і аднаўлення міру, а шукаюць новага апраўдання для працягу вайны супроць Германіі.

У апошні час правячыя кругі Англіі і Францыі прабуюць паказаць сябе ў якасці барацьбітоў за дэмакратычныя правы народаў супроць гітлерызма, прычым англійскі ўрад аб'явіў, што нібы для яго мэтай вайны супроць Германіі з'яўляецца, не больш і не менш, як «знішчэнне гітлерызма». Атрымліваецца так, што англійскія, а разам з імі і французскія, стараннікі вайны аб'явілі супроць Германіі штосьці накшталт «ідэалагічнай вайны», напамінаючай старыя рэлігійныя войны. Сапраўды, у свой час рэлігійныя войны супроць ерэтыкаў і інаверцаў былі ў модзе. Яны, як вядома прывялі да цягчайшых для народных мас вынікаў, да гаспадарчага разарэння і да культурнага адзічання народаў. Нічога іншага гэтыя войны і не маглі даць. Але гэтыя войны былі ў часы сярэдневякоўя. Ці не да гэтых часоў сярэдневякоўя, да часоў рэлігійных войн, забабонаў і культурнага адзічання цягнуць нас зноў пануючыя класы Англіі і Францыі? Ва ўсякім выпадку, пад «ідэалагічным» сцягам цяпер зацеяна вайна яшчэ большага маштаба і яшчэ большых небяспек для народаў Еўропы і ўсяго свету. Але такога роду вайна не мае для сябе ніякага апраўдання. Ідэалогію гітлерызма, як і ўсякую іншую ідэалагічную сістэму, можна прызнаваць або адмаўляць, гэта—справа палітычных поглядаў. Але любы чалавек зразумее, што ідэалогію нельга знішчыць сілай, нельга пакончыць з ёю вайной. Таму не толькі бессэнсоўна, але і злачынна весці такую вайну, як вайна за «знішчэнне гітлерызма», прыкрываемая фальшывым сцягам барацьбы за «дэмакратыю». На самой справе, ніяк нельга назваць барацьбой за дэмакратыю такія дзеянні, як закрыццё Камуністычнай партыі ва Францыі, арышты комуністычных дэпутатаў французскага парламента або ўрэзванне палітычных свабод у Англіі, неаслабяваючы нацыянальны гнёт у Індыі і т. п.

Ці не ясна, што мэта цяперашняй вайны ў Еўропе не ў тым, аб чым гавораць у афіцыяльных выступленнях для шырокага круга слухачоў ва Францыі і Англіі, г. зн. не ў барацьбе за дэмакратыю, а ў чымсьці другім, аб чым не гавораць гэтыя паны адкрыта.

Сапраўдная прычына англа-французскай вайны супроць Германіі не ў тым, што Англія і Францыя паклялiся нібы аднавіць былую Польшчу, і, вядома, не ў тым, што яны рашылі нібы ўзяць на сябе задачу барацьбы за дэмакратыю. У правячых кругоў Англіі і Францыі ёсць, зразумела, іншыя, больш сапраўдныя матывы для вайны супроць Германіі. Гэтыя матывы адносяцца не да галіны якой-небудзь ідэалогіі, а да сферы іх сугуба матэрыяльных інтарэсаў, як магутных каланіяльных дзяржаў.

Брытанская імперыя, насельніцтва якой дасягае 47 мільёнаў, уладае калоніямі з насельніцтвам у 480 мільёнаў чалавек. Каланіяльная імперыя Францыі, насельніцтва якой не перавышае 42 мільёнаў, ахватвае 70 мільёнаў жыхароў ва французскіх калоніях. Уладанне гэтымі калоніямі, даючае магчымасць эксплаатыраваць сотні мільёнаў людзей, з'яўляецца асновай сусветнага панавання Англіі і Францыі. Страх перад германскімі дамаганнямі на гэтыя каланіяльныя ўладанні—вось у чым падаплёка цяперашняй вайны Англіі і Францыі супроць Германіі, якая сур'ёзна ўсілілася за апошні час у рэзультаце развалу версальскага дагавора. Апасенні за страту сусветнага панавання дыктуюць правячым кругам Англіі і Францыі палітыку распальвання вайны супроць Германіі.

Такім чынам, імперыялістычны характар гэтай вайны відавочны для кожнага, хто хоча бачыць сапраўднае становішча спраў, хто не закрывае вачэй на факты.

З усяго гэтага відаць, каму патрэбна гэта вайна, якая вядзецца з-за сусветнага панавання. Вядома, не рабочаму класу. Такая вайна не абяцае рабочаму класу нічога, апрача крывавых афяр і бедстваў.

Пасля гэтага, мяркуйце самі: змяніўся ці не змяніўся за апошні перыяд змест такіх паняццяў, як «агрэсія», «агрэсар». Не цяжка бачыць, што ўжыванне гэтых слоў у старым сэнсе,—гэта значыць, як гэта было да апошняга рашучага павароту ў палітычных адносінах паміж Совецкім Саюзам і Германіяй і да пачатку вялікай імперыялістычнай вайны ў Еўропе,—можа параджаць толькі блытаніну ў галовах і непазбежна будзе штурхаць да памылковых вывадаў. Каб гэтага не здарылася, мы не павінны дапускаць некрытычных адносін да тых старых паняццяў, якія непрымянімы ў новай міжнароднай абстаноўцы.

Так склалася міжнародная абстаноўка ў апошні перыяд.

Пяройдзем да змяненняў, якія адбыліся ў знешнім становішчы самога Совецкага Саюза. Змяненні тут адбыліся не маленькія, але, калі гаварыць аб галоўным, то нельга не прызнаць наступнага: дзякуючы паслядоўнаму правядзенню сваёй мірнай знешняй палітыкі, нам удалося значна ўзмацніць свае пазіцыі і міжнародную вагу Совецкага Саюза. **(Працяглыя апладысменты).**

Нашы адносіны з **Германіяй,** як я ўжо сказаў, палепшыліся карэнным чынам. Тут справа развівалася па лініі ўмацавання дружаственых адносін, развіцця практычнага супрацоўніцтва і палітычнага падтрымання Германіі ў яе імкненнях да міру.

Заключаны паміж Совецкім Саюзам і Германіяй дагавор аб ненападзе абавязваў нас да нейтралітэта ў выпадку ўдзелу Германіі ў вайне. Мы паслядоўна праводзілі гэтую лінію, чаму ніяк не супярэчыць уступленне нашых войск на тэрыторыю былой Польшчы, якое пачалося 17 верасня. Дастаткова напомніць, што тады-ж 17 верасня, Совецкі ўрад разаслаў усім дзяржавам, з якімі ён мае дыпламатычныя адносіны, спецыяльную ноту з заявай аб тым, што СССР і надалей будзе праводзіць палітыку нейтралітэта ў адносінах з імі. Як вядома, нашы войскі ўступілі на тэрыторыю Польшчы толькі пасля таго, як польская дзяржава распалася і фактычна перастала існаваць. Аставацца нейтральнымі да такіх фактаў мы, зразумела, не маглі. У рэзультаце гэтых падзей перад намі паўсталі вострыя пытанні безапаснасці нашай дзяржавы. Да таго-ж Совецкі ўрад не мог не лічыцца з выключным становішчам, што стварылася для брацкага насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, якое ў разваліўшайся Польшчы аказалася кінутым на волю лёсу.

Паследуючыя падзеі поўнасцю пацвердзілі, што новыя совецка-германскія адносіны пабудаваны на моцнай базе ўзаемных інтарэсаў. Пасля ўступлення часцей Чырвонай Арміі на тэрыторыю былой польскай дзяржавы ўзніклі сур'ёзныя пытанні разгранічэння дзяржаўных інтарэсаў СССР і Германіі. Гэтыя пытанні былі быстра ўрэгуліраваны па ўзаемнай згодзе. Германа-совецкі дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй, заключаны ў канцы верасня, замацаваў нашы адносіны з германскай дзяржавай.

Адносіны Германіі з іншымі заходне-еўрапейскімі буржуазнымі дзяржавамі за апошнія два дзесяцігоддзі вызначаліся, перш за ўсё, імкненнем Германіі разбіць путы версальскага дагавора, творцамі якога былі Англія і Францыя пры актыўным удзеле Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэта, у канчатковым выніку, і прывяло да цяперашняй вайны ў Еўропе.

Адносіны Совецкага Саюза з Германіяй будаваліся на іншай аснове, не маючай нічога агульнага з інтарэсамі ўвекавечання пасляваеннай версальскай сістэмы. Мы заўсёды былі той думкі, што сільная Германія з'яўляецца неабходнай умовай моцнага міру ў Еўропе. Было-б смешна думаць, што Германію можна «проста вывесці са строю» і скінуць са шчотаў. Дзяржавы, пястуючыя гэтую глупую і небяспечную мару, не ўлічваюць сумнага вопыту Версаля, не аддаюць сабе адчоту ва ўзросшай магутнасці Германіі і не разумеюць таго, што спроба паўтарыць Версаль пры цяперашняй міжнароднай абстаноўцы, якая ў корані адрозніваецца ад абстаноўкі 1914 года— можа скончыцца для іх крахам.

Мы няўхільна імкнуліся да паляпшэння адносін з Германіяй і ўсямерна віталі такога роду імкненні ў самой Германіі. Цяпер нашы адносіны з германскай дзяржавай пабудаваны на базе дружаственых адносін, на гатоўнасці падтрымліваць імкненні Германіі да міру і, разам з тым, на жаданні ўсямерна садзейнічаць развіццю совецка-германскіх гаспадарчых адносін к узаемнай карысці абодвух дзяржаў. Трэба спецыяльна адзначыць, што змяненні ў палітычнай галіне, якія адбыліся ў совецка-германскіх адносінах, стварылі спрыяючыя прадпасылкі для развіцця совецка-германскіх гаспадарчых адносін. Апошнія гаспадарчыя перагаворы германскай дэлегацыі ў Маскве і адбываючыеся ў даны момант перагаворы совецкай гаспадарчай дэлегацыі ў Германіі падрыхтоўваюць шырокую базу для развіцця тавараабароту паміж Совецкім Саюзам і Германіяй.

Цяпер дазвольце спыніцца на падзеях, непасрэдна звязаных з уступленнем нашых войск на тэрыторыю былой польскай дзяржавы. Мне няма неабходнасці апісваць ход гэтых падзей. Аб усім гэтым падрабязна гаварылася ў нашым друку, і вы, таварышы дэпутаты, добра знаёмы з фактычнай стараной. Скажу толькі аб самым істотным.

Няма чаго даказваць, што ў момант поўнага распаду польскай дзяржавы наш урад абавязан быў працягнуць руку дапамогі пражываючым на тэрыторыі **Заходняй Украіны** і **Заходняй Беларусі** братам—украінцам і братам—беларусам. Ён так і паступіў. **(Бурныя, працяглыя апладысменты, дэпутаты ўстаюць і наладжваюць авацыю).**

Чырвоная Армія ўступіла ў гэтыя раёны пры ўсеагульным спачуванні украінскага і беларускага насельніцтва, сустракаўшага нашы войскі, як сваіх вызваліцеляў ад панскага гнёту, ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Пры баявым прасоўванні Чырвонай Арміі па гэтых раёнах у нашых воінскіх часцей былі месцамі сур'ёзныя сутычкі з польскімі часцямі, а, стала быць, былі і афяры. Якія былі гэтыя афяры, відаць з наступнага. На Беларускім фронце ў часцях Чырвонай Арміі, лічачы начальствуючы і радавы састаў, мы мелі забітых—246 і раненых—503, а ўсяго—749. На Украінскім фронце мы мелі забітых з начальствуючага і радавога састава—491 і раненых—1359, а ўсяго—1850. Значыць агульная колькасць афяр, панесеных Чырвонай Арміяй на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, складае: забітых 737, раненых—1862, гэта значыць, у цэлым—2.599 чалавек. Што датычыць нашых баявых трафеяў у Польшчы, то яны складаюць 900 з лішнім гармат, звыш 10.000 кулямётаў, звыш 300 тысяч вінтовак, больш 150 мільёнаў вінтовачных патронаў, каля 1 мільёна артылерыйскіх снарадаў, да 300 самалётаў і т. д.

Перайшоўшая да СССР тэрыторыя па сваіх размерах роўна тэрыторыі вялікай еўрапейскай дзяржавы. Так, тэрыторыя Заходняй Беларусі дасягае 108 тысяч квадратных кіламетраў, з на-

сельніцтвам у 4 мільёны 800 тысяч чалавек. Тэрыторыя Заходняй Украіны складае 88 тысяч квадратных кілометраў, з насельніцтвам у 8 мільёнаў чалавек. Такім чынам, перайшоўшая да нас тэрыторыя Заходняй Украіны разам з тэрыторыяй Заходняй Беларусі складае 196 тысяч квадратных кілометраў, а яе насельніцтва—каля 13 мільёнаў чалавек, з якіх украінцаў—больш 7 мільёнаў, беларусоў—больш 3 мільёнаў, палякаў—звыш 1 мільёна, яўрэяў—звыш 1 мільёна.

Палітычнае значэнне гэтых падзей цяжка пераацаніць. Усе паведамленні з Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі сведчаць аб тым, што насельніцтва з неапісуемым захапленнем сустрэла сваё вызваленне ад панскага гнёту і горача вітала новую вялікую перамогу совецкай улады. **(Узрыў доўгіх апладысментаў).**

Прайшоўшыя ў апошнія дні выбары ў Народнае Сабранне Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, якія тут былі ўпершыню арганізаваны на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права, з тайнай падачай галасоў, паказалі, што па крайняй меры, 9/10 насельніцтва гэтых абласцей былі ўжо даўно падрыхтаваны для з'яднання з Совецкім Саюзам. Вядомыя ўжо цяпер усім нам рашэнні Народных Сабранняў ва Львове і Беластоку сведчаць аб поўнай аднадушнасці народных выбраннікаў ва ўсіх палітычных пытаннях.

Пяройдзем да нашых адносін з прыбалтыйскімі краінамі. Як вядома, і тут адбыліся істотныя змяненні.

У аснове адносін Совецкага Саюза з **Эстоніяй, Латвіяй** і **Літвой** ляжаць адпаведныя мірныя дагаворы, заключаныя ў 1920 годзе. Па гэтых дагаворах Эстонія, Латвія і Літва атрымалі самастойнае дзяржаўнае існаванне, прычым за ўвесь прайшоўшы перыяд Совецкі Саюз нязменна праводзіў дружаственую палітыку ў адносінах гэтых, уноў створаных, малых дзяржаў. У гэтым знайшло сваё выражэнне карэннае адрозненне палітыкі совецкай улады ад палітыкі царскай Расіі, якая зверска прыгнятала малыя народы, не давала ім якой-небудзь магчымасці самастойнага нацыянальна-дзяржаўнага развіцця і пакінула ў іх нямала цягасных успамінаў. Трэба прызнаць, што вопыт прайшоўшых двух дзесяцігоддзяў развіцця дружаственых совецка-эстонскіх, совецка-латвійскіх і совецка-літоўскіх адносін стварыў спрыяючыя прадпасылкі для далейшага ўмацавання палітычных і ўсякіх іншых адносін СССР з прыбалтыйскімі суседзямі. Гэта паказалі і апошнія дыпламатычныя перагаворы з прадстаўнікамі Эстоніі, Латвіі і Літвы, і тыя дагаворы, якія былі падпісаны ў Маскве, у рэзультаце гэтых перагавораў.

Вы ведаеце, што Совецкі Саюз заключыў такія пакты ўзаемадапамогі з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, якія маюць буйнейшае палітычнае значэнне. Прынцыповая аснова гэтых пактаў аднолькавая. Яны аснованы на ўзаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам,—з аднаго боку, Эстоніяй, Латвіяй і Літвой,—з другога боку, уключаючы і ваенную дапамогу адзін аднаму, у выпадку нападу на каго-небудзь з іх. З прычыны асобага геаграфічнага становішча гэтых краін, якія з'яўляюцца свайго роду подступамі да СССР, асабліва з боку Балтыйскага мора, гэтыя пакты прадастаўляюць Совецкаму Саюзу магчымасць мець ваенна-марскія базы і аэрадромы ў пэўных пунктах Эстоніі і Латвіі, а ў адносінах Літвы ўстанаўліваюць сумесную з Совецкім Саюзам абарону літоўскай граніцы. Стварэнне гэтых совецкіх ваенна-марскіх баз і аэрадромаў на тэрыторыі Эстоніі, Латвіі і Літвы і ўвод некаторай колькасці чырвонаармейскіх часцей для аховы гэтых баз і аэрадромаў забяспечвае надзейную апору абароны не толькі для Совецкага Саюза, але і для саміх прыбалтыйскіх дзяржаў і, тым самым, служыць справе захавання міру, у якім зацікаўлены нашы народы.

Меўшыя месца ў апошні час дыпламатычныя перагаворы з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой паказалі, што паміж намі існуе дастатковае давер'е і патрэбнае разуменне неабходнасці ажыццяўлення гэтых ваенна-абараняльных мер у інтарэсах як Совецкага Саюза, так і саміх гэтых дзяржаў. У перагаворах поўнасцю выявілася імкненне іх удзельнікаў да захавання міру і да забеспячэння безапаснасці для нашых народаў, занятых мірнай працай. Усё гэта і забяспечыла паспяховае сканчэнне перагавораў і заключэнне пактаў узаемадапамогі, маючых важнае гістарычнае значэнне.

Асобы характар указаных пактаў узаемадапамогі ніяк не азначае якога-небудзь умяшання Совецкага Саюза ў справы Эстоніі, Латвіі і Літвы, як гэта прабуюць паказаць некаторыя органы замежнага друку. Наадварот, усе гэтыя пакты ўзаемадапамогі цвёрда агаварваюць недатыкальнасць суверэнітэта падпісаўшых іх дзяржаў і прынцып неўмяшання ў справы другой дзяржавы. Гэтыя пакты зыходзяць з узаемнай павагі дзяржаўнай, соцыяльнай і эканамічнай структуры другой стараны і павінны ўмацаваць аснову мірнага добрасуседскага супрацоўніцтва паміж нашымі народамі. Мы стаім за чэснае і пунктуальнае правядзенне ў жыццё заключаных пактаў на ўмовах поўнай узаемнасці і заяўляем, што балбатня аб советызацыі прыбалтыйскіх краін выгодна толькі нашым агульным ворагам і ўсякім антысовецкім правакатарам.

На аснове дасягнутага паляпшэння палітычных адносін з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, Совецкі Саюз пайшоў шырока насустрач гаспадарчым патрэбам гэтых дзяржаў, заключыўшы адпаведныя гандлёвыя пагадненні. У сувязі з гэтымі гаспадарчымі пагадненнямі, тавараабарот з прыбалтыйскімі краінамі павялічваецца ў некалькі разоў і мае спрыяючую перспектыву для далейшага росту. Ва ўмовах, калі гандаль усіх еўрапейскіх краін, у тым ліку і нейтральных дзяржаў, перажывае велізарныя затрудненні, гэтыя эканамічныя пагадненні СССР з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой маюць для іх вельмі буйнае станоўчае значэнне.

Такім чынам, збліжэнне, якое адбылося паміж СССР, Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, будзе садзейнічаць больш хуткаму ўздыму сельскай гаспадаркі, прамысловасці, транспарта і наогул народнаму добрабыту нашых прыбалтыйскіх суседзяў.

Прынцыпы совецкай палітыкі ў адносінах малых краін з асобай сілай прадэманстраваны на прыкладзе дагавора аб перадачы Літоўскай рэспублікі горада Вільна і Віленскай вобласці. Пры гэтым літоўская дзяржава з яе насельніцтвам у два з палавінай мільёны чалавек,

значна расшырае сваю тэрыторыю, павялічвае на 550 тысяч чалавек сваё насельніцтва і атрымлівае горад Вільна, лік жыхароў якога амаль у два разы перавышае насельніцтва цяперашняй літоўскай сталіцы. Совецкі Саюз пайшоў на перадачу горада Вільна Літоўскай рэспублікі не таму, што ў ім пераважае літоўскае насельніцтва. Не, у Вільна большасць складае нелітоўскае насельніцтва. Але совецкі ўрад лічыўся з тым, што горад Вільна, які Польшчай быў насільственна адторгнут ад Літвы, павінен належаць Літве, як такі горад, з якім звязана, з аднаго боку, гістарычнае мінулае літоўскай дзяржавы, а з другога—нацыянальныя спадзяванні літоўскага народа. У замежным друку ўказвалася, што ў сусветнай гісторыі не было яшчэ такога выпадку, каб вялікая дзяржава па ўласнай волі аддавала малой дзяржаве такі вялікі горад. Тым ярчэй гэты акт совецкай дзяржавы дэманстрыруе яго добрую волю.

У асобным становішчы знаходзяцца нашы адносіны з Фінляндыяй. Гэта аб'ясняецца, галоўным чынам, тым, што ў Фінляндыі больш сказваюцца рознага роду знешнія ўплывы з боку трэціх дзяржаў. Бесстаронныя людзі павінны, аднак, прызнаць, што тыя-ж пытанні забеспячэння безапаснасці Совецкага Саюза і, асабліва, Ленінграда, якія стаялі ў перагаворах з Эстоніяй, стаяць і ў перагаворах з Фінляндыяй. Можна сказаць, што ў некаторых адносінах пытанні безапаснасці для Совецкага Саюза тут стаяць нават вастрэй, паколькі галоўны, пасля Масквы, горад совецкай дзяржавы—Ленінград, знаходзіцца ўсяго ў 32 кілометрах ад граніцы Фінляндыі. Гэта значыць, што Ленінград знаходзіцца ад граніцы другой дзяржавы на адлегласці меншай, чым гэта трэба для артылерыйскага абстрэлу з сучасных дальнабойных гармат. З другога боку, марскія подступы да Ленінграда таксама ў значнай меры залежаць ад таго—варожую або дружаственную пазіцыю ў адносінах да Совецкага Саюза займае Фінляндыя, якой належыць уся паўночная частка ўзбярэжжа Фінскага заліва і ўсе астравы ўздоўж цэнтральнай часткі Фінскага заліва.

Лічачыся з такім становішчам, а таксама са стварыўшайся ў Еўропе абстаноўкай, можна разлічваць, што з боку Фінляндыі будзе праяўлена належнае разуменне.

На чым асноўваліся адносіны Совецкага Саюза з Фінляндыяй за ўсе гэтыя годы? Вядома, што асновай гэтых адносін з'яўляецца мірны дагавор 1920 года па тыпу нашых дагавораў з іншымі нашымі балтыйскімі суседзямі. Совецкі Саюз сваім свабодным волевыяўленнем забяспечыў самастойнае і незалежнае існаванне Фінляндыі. Не можа быць сумнення, што толькі совецкі ўрад, які прызнае прынцып свабоднага развіцця нацыянальнасцей, мог пайсці на гэты крок. Трэба сказаць, што ніякі ўрад у Расіі, апрача совецкага, не можа дапусціць існавання незалежнай Фінляндыі ля самых варот Ленінграда. Аб гэтым красамоўна гаворыць вопыт з «дэмакратычным» урадам Керэнскага—Цэрэтэлі, не гаворачы ўжо аб урадзе князя Львова—Мілюкова і, тым больш аб царскім урадзе. Няма сумнення, гэта важная акалічнасць магла-б служыць добрай прадпасылкай для паляпшэння совецка-фінскіх адносін, у якіх, як відаць, Фінляндыя не менш зацікаўлена чым Совецкі Саюз.

Совецка-фінскія перагаворы пачаліся нядаўна, па нашай ініцыятыве. Што з'яўляецца прадметам гэтых перагавораў? Не цяжка зразумець, што ў сучаснай міжнароднай абстаноўцы, калі ў цэнтры Еўропы разгортваецца вайна паміж буйнейшымі дзяржавамі, чрэватая вялікімі нечаканасцямі і небяспекамі для ўсіх еўрапейскіх дзяржаў,—Совецкі Саюз не толькі мае права, але і абавязан прымаць сур'ёзныя меры для ўмацавання сваёй безапаснасці. Пры гэтым, натуральна, што совецкі ўрад праяўляе асобыя клопаты адносна Фінскага заліва, які з'яўляецца марскім подступам да Ленінграда, а таксама адносна той сухапутнай граніцы, якая ў якіх-небудзь 30 кілометрах навісла над Ленінградам. Я напомню, што насельніцтва Ленінграда дасягнула трох з палавінай мільёнаў, што амаль роўна насельніцтву ўсёй Фінляндыі, якая налічвае 3 мільёны 650 тысяч жыхароў. **(Вясёлае ажыўленне ў зале).**

Наўрад ці ёсць падставы спыняцца на тых небыліцах, якія распаўсюджваюцца замежнай прэсай аб прапановах Совецкага Саюза ў перагаворах з Фінляндыяй. Адны сцвярджаюць, што СССР «патрабуе» сабе г. Віпуры (Выбарг) і паўночную частку Ладажскага возера. Скажам ад сябе, што гэта—чысты вымысел і хлусня. Іншыя сцвярджаюць, што СССР «патрабуе» перадачы яму Аландскіх астравоў. Гэта—такі-ж вымысел і хлусня. Балбочуць яшчэ аб якіхсьці прэтэнзіях, нібы існуючых у Совецкім Саюзе ў адносінах Швецыі і Нарвегіі. Але гэта беспардонная хлусня проста не заслугоўвае абвяржэння. **(Агульны смех).** На самай справе, нашы прапановы ў перагаворах з Фінляндыяй з'яўляюцца максімальна скромнымі і абмяжоўваюцца тым мінімумам, без якога немагчыма забяспечыць безапаснасць СССР і наладзіць дружаскія адносіны з Фінляндыяй.

Мы пачалі перагаворы з прадстаўнікамі Фінляндыі, для чаго фінляндскі ўрад камандзіраваў у Маскву пп. Паасіківі і Танера, з прапановай заключыць совецка-фінскі пакт узаемадапамогі, прыкладна, па тыпу нашых пактаў узаемадапамогі з іншымі прыбалтыйскімі дзяржавамі. Паколькі, аднак, фінляндскі ўрад заявіў нам, што заключэнне такога пакта супярэчыла-б занятай ім пазіцыі абсалютнага нейтралітэта, мы не сталі настайваць на нашай прапанове.

Мы прапанавалі тады перайсці да канкрэтных пытанняў, у якіх мы зацікаўлены з пункту гледжання забеспячэння безапаснасці СССР і, у асаблівасці, безапаснасці Ленінграда, як з боку мора—у Фінскім заліве, так і з боку сушы, з прычыны празмернай блізасці пагранічнай лініі да Ленінграда. Мы прапанавалі дагаварыцца аб тым, каб адсунуць на поўнач ад Ленінграда на некалькі дзесяткаў кілометраў совецка-фінскую граніцу на Карэльскім перашэйку. Узамен гэтага мы прапанавалі перадаць Фінляндыі частку тэрыторыі Совецкай Карэліі, перавышаючую ў два разы тэрыторыю, перадаваемую Фінляндыяй Совецкаму Саюзу. Мы прапанавалі таксама дагаварыцца аб тым, каб Фінляндыя здала нам у арэнду на пэўны тэрмін невялікі ўчастак сваёй тэрыторыі ў раёне ўваходу ў Фінскі заліў, каб мы маглі там арганізаваць ваенна-марскую базу. Пры наяўнасці совецкай ваенна-марской базы ля паўднёвага ўваходу ў Фінскі заліў, а іменна ў

Балтыйскім порце, як гэта абумоўлена совецка-эстонскім пактам узаемадапамогі, стварэнне ваенна-марской базы ля паўночнага ўваходу ў Фінскі заліў магло-б поўнасцю забяспечыць бяспаснасць Фінскага заліва супроць варожых замахаў з боку іншых дзяржаў. Мы не сумняваемся ў тым, што стварэнне такой базы адпавядае інтарэсам не толькі Совецкага Саюза, але і безапаснасці самой Фінляндыі. Іншыя нашы прапановы і, у прыватнасці, наша прапанова аб абмене тэрыторыі некаторых астравоў у Фінскім заліве, а таксама часткі поўастравоў Рыбачы і Сярэдні на двайную па размерах тэрыторыю ў Совецкай Карэліі, як відаць не сустракаюць супярэчнасцей з боку фінляндскага ўрада. Розныя галоссі ў адносінах некаторых нашых прапаноў яшчэ не пераадолены, а зробленыя ў гэтых адносінах Фінляндыяй уступкі, напрыклад, частковая ўступка тэрыторыі на Карэльскім перашэйку, яўна не дасягаюць мэты.

Мы зрабілі, далей, рад новых крокаў насустрач Фінляндыі. Мы сказалі, што калі будуць прыняты нашы асноўныя прапановы, мы гатовы зняць нашы пярэчанні супроць узбраення Аландскіх астравоў, на чым ужо даўно настойвае фінляндскі ўрад. Мы агаварылі толькі, што мы знімаем свае пярэчанні супроць узбраення Аландскіх астравоў пры ўмове, што ўказаныя ўзбраенні будуць праводзіцца нацыянальнымі сіламі самой Фінляндыі і што ў гэтых узбраеннях трэція краіны не будуць прымаць ніякага ўдзелу, паколькі і СССР не ўдзельнічае ў іх. Мы прапанавалі таксама Фінляндыі правесці на ўсёй совецка-фінскай граніцы на Карэльскім перашэйку раззбраенне ўмацаваных раёнаў, што павінна цалкам адпавядаць інтарэсам Фінляндыі. Мы выразілі, далей, жаданне ўзмацніць совецка-фінскі пакт ненападу дадатковымі ўзаемнымі гарантыямі. Нарэшце, умацаванне палітычных совецка-фінскіх адносін, несумненна, з'явілася-б выдатнай базай і для быстрага пад'ёму гаспадарчых адносін паміж нашымі краінамі.

Такім чынам, мы гатовы ісці насустрач Фінляндыі ў тых пытаннях, у якіх яна асабліва зацікаўлена.

Пасля ўсяго гэтага мы не думаем, каб з боку Фінляндыі сталі шукаць повяду да зрыву мяркуемага пагаднення. Гэта не адпавядала-б палітыцы дружаственных совецка-фінскіх адносін і, вядома, нанесла-б сур'ёзную шкоду Фінляндыі.

Мы ўпэўнены, што кіруючымі фінляндскімі кругамі будзе правільна зразумета значэнне ўмацавання совецка-фінскіх дружаственых адносін, і фінляндскія дзеячы не паддадуцца якому-небудзь антысовецкаму даўленню і падбухторванню з боку каго-б то ні было.

Я павінен, аднак, паведаміць, што нават прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі знайшоў умесным умяшацца ў гэтыя пытанні, што цяжка ўзгадніць з палітыкай амерыканскага нейтралітэта. У сваім пасланні 12 кастрычніка на імя т. Калініна—Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета, п. Рузвельт выразіў надзею на захаванне і развіццё дружалюбных і мірных адносін паміж СССР і Фінляндыяй. Можна падумаць, што ў Злучаных Штатаў Амерыкі лепш абстаяць справы, скажам, з Філіпінамі або з Кубай, якія даўно патрабуюць ад ЗША свабоды і незалежнасці, і не могуць іх атрымаць, чым у Совецкага Саюза з Фінляндыяй, якая даўно ўжо атрымала ад Совецкага Саюза і свабоду і дзяржаўную незалежнасць.

На пасланне п. Рузвельта т. Калінін адказаў наступным чынам:

> «Лічу ўмесным напомніць Вам, пан прэзідэнт, што дзяржаўная незалежнасць Фінляндскай рэспублікі была прызнана свабодным волевыяўленнем совецкага ўрада 31 снежня 1917 года, і што суверэнітэт Фінляндыі забяспечан за ёю мірным дагаворам паміж РСФСР і Фінляндыяй ад 14 кастрычніка 1920 года. Указанымі актамі совецкага ўрада вызначаны былі асноўныя прынцыпы ўзаемаадносін паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй. У адпаведнасці з гэтымі прынцыпамі вядуцца і цяперашнія перагаворы паміж совецкім урадам і ўрадам Фінляндыі. Наперакор тэндэнцыйным версіям, распаўсюджваемым кругамі, відавочна, не зацікаўленымі ў еўрапейскім міры, адзінай мэтай указаных перагавораў з'яўляецца ўмацаванне ўзаемаадносін паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй і ўмацаванне дружаственага супрацоўніцтва абодвух краін у справе забеспячэння безапаснасці Совецкага Саюза і Фінляндыі».

Пасля такога яснага адказу Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР павінна быць зусім зразумела, што пры наяўнасці добрай волі, фінляндскі ўрад пойдзе насустрач нашым мінімальным прапановам, якія не толькі не супярэчаць нацыянальным і дзяржаўным інтарэсам Фінляндыі, але ўмацоўваюць яе знешнюю безапаснасць і ствараюць шырокую базу для далейшага шырокага развіцця палітычных і гаспадарчых адносін паміж нашымі краінамі.

Некалькі слоў аб перагаворах з **Турцыяй.**

Аб сутнасці гэтых перагавораў пішуць за граніцай усякую небыліцу. Адны сцвярджаюць, што СССР нібы патрабаваў перадачы раёнаў Ардагана і Карса. Скажам ад сябе, што гэта—суцэльны вымысел і хлусня. Іншыя сцвярджаюць, што СССР патрабаваў нібы змянення міжнароднай канвенцыі, заключанай у Монтры, і пераважных правоў для СССР у пытанні аб пралівах. Гэта—

Члены Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, наведалі калгас „Чырвоны спецыяліст", Мінскага раёна, дзе дэталёва азнаёміліся з жыццём калгаса. На здымку: злева направа: Калгасніцы Я. С. Чуліцкая, Ю. Ф. Чарняўская расказваюць члену Поўнамоцнай камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі тав. Бурмака аб дасягненнях калгаса.

таксама вымысел і хлусня. На самой справе гутарка ішла аб заключэнні двухбаковага пакта ўзаемадапамогі, абмежаванага раёнамі Чорнага мора і праліваў. СССР лічыў, што заключэнне такога пакта не можа пабудзіць яго да дзеянняў, якія маглі-б уцягнуць яго ва ўзброены канфлікт з Германіяй, гэта па-першае, і што СССР павінен мець гарантыю, што з прычыны пагрозы вайны Турцыя не прапусціць ваенных караблёў нечорнаморскіх дзяржаў праз Басфор у Чорнае мора, гэта па-другое. Турцыя адхіліла абедзве гэтыя агаворкі СССР і тым зрабіла немагчымым заключэнне пакта.

Совецка-турэцкія перагаворы не прывялі да заключэння пакта, але яны дапамаглі выясніць або, па крайняй меры, прашчупаць рад цікавячых нас палітычных пытанняў. У сучаснай міжнароднай абстаноўцы асабліва важна ведаць сапраўдны твар і палітыку дзяржаў, адносіны з якімі маюць сур'ёзнае значэнне. У палітыцы Турцыі нам многае стала цяпер куды ясней, як у рэзультаце маскоўскіх перагавораў, так і ў рэзультаце апошніх знешне-палітычных актаў турэцкага ўрада.

Як вядома, урад Турцыі палічыў за лепшае звязаць свой лёс з пэўнай групіроўкай еўрапейскіх дзяржаў, прымаючых удзел у вайне. Ён заключыў пакт узаемадапамогі з Англіяй і Францыяй, якія ўжо два месяцы вядуць вайну супроць Германіі. Тым самым Турцыя канчаткова адкінула асцярожную палітыку нейтралітэта і ўступіла ў арбіту разгортваючайся еўрапейскай вайны. Гэтым вельмі задаволены як у Англіі, так і ва Францыі, якія хочуць пабольш нейтральных краін уцягнуць у сваю сферу вайны. Ці не пашкадуе аб гэтым Турцыя—гадаць не будзем. **(Ажыўленне ў зале).** Нам прыходзіцца толькі адзначыць гэтыя новыя моманты ў знешняй палітыцы нашага суседа і ўважліва сачыць за развіццём падзей.

Калі Турцыя да пэўнай ступені цяпер звязала сабе рукі і схілілася да рыскованай для яе падтрымкі адной з ваюючых краін, то, відавочна, турэцкі ўрад сазнае адказнасць, якую ён гэтым узяў на сябе. Але гэта не тая знешняя палітыка, якой следуе Совецкі Саюз і дзякуючы якой Совецкі Саюз ужо забяспечыў не мала знешне-палітычных поспехаў. Совецкі Саюз лічыць за лепшае і надалей пакінуць сабе рукі свабоднымі, паслядоўна праводзіць сваю палітыку нейтралітэта і не толькі не садзейнічаць распальванню вайны, а садзейнічаць умацаванню наяўных імкненняў да аднаўлення міру. Мы ўпэўнены ў тым, што палітыка міру, якую няўхільна праводзіць СССР, мае і ў далейшым лепшыя перспектывы. Гэтую палітыку мы будзем праводзіць і ў раёне Чорнага мора з упэўненасцю, што поўнасцю забяспечым належнае яе правядзенне, як гэтага патрабуюць інтарэсы Совецкага Саюза і дружаственных яму дзяржаў. **(Апладысменты).**

Цяпер аб адносінах з **Японіяй.**

За апошні час у совецка-японскіх адносінах ёсць вядомае паляпшэнне. Гэтае паляпшэнне намецілася з часу нядаўняга маскоўскага пагаднення, у рэзультаце якога быў ліквідаван вядомы канфлікт на Мангола-Манчжурскай граніцы.

На працягу раду месяцаў, дакладней гаворачы на працягу мая, чэрвеня, ліпеня, жніўня і да сярэдзіны верасня, у Номанханскім раёне, прымыкаючым да мангола-манчжурскай граніцы, адбываліся ваенныя дзеянні з удзелам япона-манчжурскіх і совецка-мангольскіх войск. У баявых дзеяннях за гэты перыяд удзельнічалі ўсе роды зброі, уключаючы авіяцыю і цяжкую артылерыю, а баі часамі прымалі вельмі кровепралітны характар. Нікому непатрэбны канфлікт выклікаў нямалыя афяры на нашай старане, але гэтыя афяры былі ў некалькі разоў больш на япона-манчжурскай старане. Нарэшце, Японія звярнулася да нас з прапановай ліквідаваць канфлікт, і мы ахвотна пайшлі насустрач японскаму ўраду.

Як вядома, канфлікт быў выклікан імкненнем Японіі прысвоіць частку тэрыторыі Мангольскай Народнай Рэспублікі і гэтым шляхам насільствена змяніць у сваю карысць мангола-манчжурскую граніцу. Такі аднабаковы метад павінен быў сустрэць рашучы адпор і паказаў яшчэ раз сваю поўную несастаяцельнасць, калі справа датычыць Совецкага Саюза або яго саюзнікаў. Калі на злапалучным прыкладзе Польшчы было нядаўна прадэманстравана, як танна іншы раз каштуюць пакты ўзаемадапамогі, падпісаныя некаторымі вялікімі дзяржавамі Еўропы **(смех),** то на мангола-манчжурскай граніцы было прадэманстравана зусім іншае. Тут было прадэманстравана значэнне пакта ўзаемадапамогі, пад якім стаіць подпіс Совецкага Саюза. **(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты).**

Што датычыць указанага канфлікта, то ў рэзультаце совецка-японскага пагаднення, заключанага 15 верасня ў Маскве ён быў ліквідаван і мір быў поўнасцю адноўлен на мангола-манчжурскай граніцы. Тым самым быў зроблен першы крок да паляпшэння совецка-японскіх адносін.

На чарзе стаіць стварэнне змешанай пагранічнай камісіі з прадстаўнікоў совецка-мангольскай і японо-манчжурскай старон. Гэтай камісіі прадстаіць разглядзець некаторыя спрэчныя пагранічныя пытанні. Можна не сумнявацца, што калі добрая воля будзе праяўлена не толькі з нашага боку, то метад дзелавога разгляду пагранічных пытанняў дасць станоўчыя рэзультаты.

Апрача таго, выяснілася магчымасць прыступіць да перагавораў па пытаннях совецка-японскага гандлю. Нельга не прызнаць, што развіццё

Сход медыцынскіх работнікаў ГІФОН'а, прысвечаны ўнечарговай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Чытку даклада Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў В. М. Молатава праводзіць кіраўнік агіткалектыва, урач-комуніст В. Я. Аўраменко.
Фота В. Баранава (Фотахроніка БЕЛТА).

совецка-японскага тавараабароту адпавядае інтарэсам абодвух дзяржаў.

Такім чынам, мы маем падставы гаварыць аб намеціўшымся паляпшэнні нашых адносін з Японіяй. Зараз цяжка меркаваць, у якой меры можна разлічваць на быстрае развіццё гэтай тэндэнцыі. Нам яшчэ не ўдалося выясніць, наколькі сур'ёзна падрыхтавана глеба для гэтага ў японскіх кругах. Са свайго боку павінен сказаць, што мы станоўча адносімся да гэтага роду японскіх прапаноў, падыходзячы да іх з пункту гледжання асноўнай нашай палітычнай пазіцыі і клопатаў аб інтарэсах міру.

Нарэшце, некалькі слоў аб ваеннай кантрабандзе і аб вывазе зброі з нейтральных краін у ваюючыя краіны.

Гэтымі днямі была апублікавана нота совецкага ўрада ў адказ на ноты Англіі ад 6 і 11 верасня. У нашай ноце ізложан пункт гледжання СССР на пытанні ваеннай кантрабанды і ўказана, што совецкі ўрад не можа прылічыць да ваеннай кантрабанды прадукты харчавання, паліва для мірнага насельніцтва і прадметы адзення, што забараніць увоз прадметаў масавага спажывання—значыць, асудзіць дзяцей, жанчын, старыкоў, хворых на бедствы і галодную смерць. Совецкі ўрад указвае ў ноце, што такія пытанні не могуць быць прадметам аднабаковага рашэння, як зрабіла гэта Англія, а павінны быць вырашаны з агульнай згоды дзяржаў. Мы разлічваем, што нейтральныя краіны, а таксама грамадская думка Англіі і Францыі прызнаюць правільнасць нашай пазіцыі і прымуць меры к таму, каб вайна паміж арміямі ваюючых краін не была ператворана ў вайну супроць дзяцей, жанчын, старыкоў, хворых. Ва ўсякім выпадку наша краіна, як краіна нейтральная, не зацікаўленая ў распальванні вайны, прыме ўсе меры да таго, каб зрабіць вайну менш разбуральнай, аслабіць яе і паскорыць яе сканчэнне ў інтарэсах міру.

З пункту гледжання такой перспектывы рашэнне амерыканскага ўрада аб адмене забароны (эмбарго) на вываз зброі ў ваюючыя краіны выклікае законнае сумненне. Наўрад ці можа быць сумненне, што гэта рашэнне будзе мець сваім рэзультатам не аслабленне вайны, і не набліжэнне канца вайны, а наадварот—узмацненне, абвастрэнне і зацяжку вайны. Вядома, такое рашэнне можа забяспечыць высокія барышы для амерыканскай ваеннай прамысловасці. Але вось пытанне: ці можа гэта акалічнасць служыць апраўданнем адмены эмбарго на вываз зброі з Амерыкі? Ясна што не можа.

Такая міжнародная абстаноўка ў цяперашні час.

Такія асновы знешняй палітыкі Совецкага Саюза.

(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю, усе дэпутаты ўстаюць.)

Члены Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі сярод дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР, на Трэцяй Унечарговай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР.

З'еднаны беларускі народ

У апошні час жыццё Совецкага народа знамянальна асабліва палітычна важнымі гістарычнымі падзеямі.

Унечарговая Пятая Сесія Вярхоўнага Совета СССР, якая засядала з 31 кастрычніка па 3 лістапада, упісала ў гісторыю чалавецтва яшчэ адну выдатную старонку. Сесія Вярхоўнага Совета Саюза задаволіла просьбу і волю народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Яна прыняла ў адзіную сям'ю вялікага Совецкага Саюза вызвалены народ, які вякамі стагнаў пад ігам капіталістаў і памешчыкаў.

Выступленне на Пятай Сесіі дэлегата Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі тав. Прытыцкага і ўсе выступленні дэлегатаў па гэтаму пытанню былі пранікнуты бязмежнай любоўю да Совецкага Саюза—адзінай радзімы ўсіх прыгнечаных.

Іх гарачыя словы ўдзячнасці доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Совецкаму Ураду за вызваленне з-пад польскага іга прагучэлі з вялікай сілай па ўсяму свету. Яны заявілі, што ў адзіным парыве і імкненні разам, руку аб руку з народамі Совецкага Саюза будуць будаваць соцыялізм, працаваць і змагацца пад кіраўніцтвам Комуністычнай Партыі, пад кіраўніцтвам Совецкага Урада, пад мудрым вадзіцельствам лепшага друга і правадыра ўсіх працоўных таварыша Сталіна.

14 лістапада закрылася Унечарговая Трэцяя Сесія Вярхоўнага Совета БССР, на якой была абмеркавана заява Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Неперадаваема лікаванне і радасць беларускага народа, назаўсёды з'яднанага ў адзіную беларускую дзяржаву.

Упершыню ў гісторыі прадстаўнікі Заходняй Беларусі свабодна, проста і смела выступалі з трыбуны і расказвалі аб сваім нядаўнім мінулым—бяспраўным, цёмным і сумным жыцці працоўных пры панаванні польскіх заправіл.

Як праўдзіва і вобразна сказала на Унечарговай Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета БССР член Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі тав. Тарасюк:

— Мы зараз усе шчаслівыя грамадзяне Совецкага Саюза. Цяжка мне выразіць сваё шчасце. Якая я шчаслівая, што я, жанчына, якая раней не мела ніякіх правоў, зараз магу і маю права тут выступаць, што я нароўні з мужчынамі магу будаваць новае жыццё, што мне аказана вялікае давер'е нашага народа—я старшыня мясцовага валаснога камітэта.

Гістарычныя рашэнні Ўнечарговай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР і Унечарговай Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета БССР ніколі не згладзяцца з памяці вызваленых народаў Заходняй Беларусі.

З гордасцю і любоўю кожны працоўны паўтарае бессмяротныя словы совецкага паэта Маякоўскага:

Читайте,
завидуйте,
я—
Гражданин
Советского Союза.

Вякамі застанецца ў памяці гістарычны дзень, калі ў цяжкі момант пагрозы разбурэння і знішчэння народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны вялікі Совецкі Саюз узяў пад сваю абарону іх жыццё і маёмасць.

Польская дзяржава была турмой народаў. Беспрацоўе, голад і холад былі ўдзелам працоўных у панскай Польшчы.

Позіркі народаў Заходняй Беларусі былі звернуты да нас—на Усход. Працоўныя бачылі, што адзіны збавіцель ад прыгнёту гэта—Совецкі Саюз. Вось чаму Чырвоная Армія, байцы, камандзіры і палітработнікі былі сустрэты як найдаражэйшыя госці і вызваліцелі. Іх цалавалі, як родных сыноў і братоў.

28 верасня выбраннікі вызваленага народа сабраліся ў горадзе Беластоку на сваё Народнае Сабранне. Выконваючы волю і патрабаванне народа, яны першым пытаннем абмеркавалі аб дзяржаўнай уладзе. Совецкую ўладу! І толькі Совецкую Уладу!—такім было рашэнне выбраннікаў народа.

Доўгія годы адзінакроўныя браты і сёстры былі штучна раздзелены граніцамі. Зараз беларускі народ жадае разам жыць і будаваць сваё радаснае і шчаслівае жыццё. Вось чаму другім пытаннем парадку дня Народнага Сабрання было вырашэнне аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

На працягу ўсяго часу панавання польскай шляхты на тэрыторыі Заходняй Беларусі капіталісты і фабрыканты падвяргалі жудаснай эксплаатацыі рабочых. Гэтыя ізвергі давялі да разарэння рабочы клас, прымушалі за бясцэнак працаваць на сваіх прадпрыемствах. Рабочых і работніц не лічылі за людзей. За малейшы пратэст выганялі з фабрык і заводаў. Народнае Сабранне рашыла пазбавіць рабочы клас ад здзекаў і бізуна капіталістаў.

Польскія магнаты і памешчыкі пазбавілі сялян зямлі, марылі голадам і холадам дзесяткі тысяч батракоў. Забаранялі сялянам нагой ступаць на іх абшары. За адну сухую галінку, узятую ў панскім лесе, беспакарана вешалі і расстрэльвалі сялян. Зараз гэтаму раз'юшанаму панаванню пакладзен канец.

«Ад гэтага часу ўся зямля Заходняй Беларусі з яе нетрамі, а таксама лясы і воды аб'яўляюцца агульнанародным здабыткам, г. зн. дзяржаўнай уласнасцю». (З дэкларацыі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель.)

Не будуць больш капіталісты і памешчыкі эксплаатаваць працоўных Заходняй Беларусі. Польскім панам не ступаць паганым ботам па вызваленай зямлі. Народы Заходняй Беларусі аб'яднаны ў адзіную дружную сям'ю народаў Совецкага Саюза.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам вялікага і мудрага правадыра народаў таварыша Сталіна будзе шпаркім тэмпам ісці росквіт культуры і гаспадаркі былой Заходняй Беларусі.

Няхай жыве навекі з'еднаны ў адзіную сям'ю адзінаццацімільённы беларускі народ!

Дзяўчына з ружжом

Ужо даўно скончыўся рабочы дзень у часовым упраўленні горада Валкавыска. Разышліся наведвальнікі. У памяшканні наступіла цішыня. Толькі час-адчасу чутны павольныя, роўныя крокі. Гэта маладая, бадзёрая дзяўчына з ружжом у руках з гонарам выконвае свае абавязкі байца Рабочай гвардыі.

На яе грудзях красуецца пяціканцовая звязда з чырвоным бантам. На левым рукаве верхняй вопраткі дбайна прышыта чырвоная павязка з літарамі, якія выразна азначаюць яе пачэсную пасаду.

У часы работы часовага ўпраўлення тав. Рубіна ветліва сустракае наведвальнікаў, гутарыць з імі, раіць куды звярнуцца па пэўнаму пытанню.

— Вы да каго,—пытае тав. Рубіна,—па якой справе?

— Я да старшыні часовага ўпраўлення.

— Калі ласка, заходзьце.

Вось падыходзіць старэнькая жанчына, год шасцідзесяці. Яна просіць даць ёй совецкую газету. Маладая дзяўчына хутка накіроўваецца ў кабінет і адтуль выносіць пачку свежых нумароў совецкіх газет і раздае наведвальнікам.

З першых дзён прыходу часцей Чырвонай Арміі Ева Самуйлаўна Рубіна актыўна ўключылася ў грамадска-карысную работу. Гэта энергічная, актыўная, жыццёрадасная дзяўчына праяўляе ўсе свае здольнасці для таго, каб прынесці хоць малейшую карысць шчасліваму грамадству. Яна з'яўляецца прадстаўніком вызваленага народа, які вякамі прыгнятаўся польскімі памешчыкамі і капіталістамі.

Яе кароткая біяграфія і жыццё—лёс усіх працоўных дзяўчат, якія жылі ў былой панскай Польшчы. У нішчаце і голадзе праходзілі дзіцячыя годы Евы Самуйлаўны. Рана памёр бацька, пакінуўшы 6 душ сям'і. Асталіся пяць сясцёр і старэнькая маці. Увесь цяжар жыцця абрушыўся на плечы маладых бедных сясцёр. Каб выратаваць сям'ю ад голаду і галечы, трэба было знайсці сродкі для існавання. Ева Самуйлаўна з вялікімі цяжкасцямі ўстрайваецца на работу ў пякарню ў якасці прадаўшчыцы булак.

Яна бачыла несправядлівасць і здзекі, бачыла што багацеі жывуць за кошт працоўных. Ёй хацелася, каб усе рабочыя і сяляне гэта зразумелі. І вось яна пачынае ў падполлі прымаць удзел у агітацыйна-масавай рабоце сярод насельніцтва. Яна расказвае ім праўду, выкрывае хлусню і агіднасць польскіх заправіл.

Даведаўшыся аб гэтым паліцэйскія шпікі пачынаюць праследваць сям'ю Рубіных. Не адзін раз рабіліся вобыскі ў кватэры, ламалі печы, узрывалі падлогу, рыліся ў шафах, але нічога так і не ўдалося знайсці.

Помста і нянавісць да існуючага ладу ў Рубіных узрастала з кожным днём. Іх погляды былі накіраваны да шчаслівых братоў і сясцёр Совецкага Саюза. Іх не на мінуту не пакідала думка аб шчаслівых людзях краіны Советаў.

Прыход Чырвонай Арміі ўскалыхнуў усю сям'ю Рубіных. Старэйшую сястру ўзялі на работу ў часовае ўпраўленне города. Сярэднюю сястру Еву прынялі ў рады Рабочай гвардыі. А 18-гадовая Іда ў часе выбараў у Народнае Сабранне праявіла сябе, як добры масавік і арганізатар моладзі.

Стомлены твар Евы ззяе радасцю. Яна бязмежна рада, што з'яўляецца грамадзянкай Совецкага Саюза. Яна марыць быць лётчыкам, актыўным удзельнікам у комсамольскім жыцці. Поўна нястрымнай энергіі толькі працаваць і працаваць.

Гэтая маладая жыццерадасная дзяўчына марыць аб вучобе, яна хоча паступіць у ваенную школу і набыць сабе ваенную спецыяльнасць, каб з вінтоўкай у руках ахоўваць мірнае жыццё вызваленага горада.

Час настаў. Па прыкладу юнакоў і дзяўчат Совецкага Саюза, якія з прагнасцю авалодваюць вяршынямі навукі яна зможа стаць кім жадае. Тысячы такіх, як тав. Рубіна, будуць нястомнымі барацьбітамі за сваю радасную і шчаслівую будучыню.

Валкавыск. **А. Лідзіна.**

Святкаванне 22 гадавіны Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі ў гор. Гомелі.
На здымку: Калона Чырвонага Крыжа на дэманстрацыі.
Фота А. Шаевіча (Фотахроніка БЕЛТА).

Дэпутат народа

Сумна праходзілі дні, месяцы і годы ў дочкі рабочага-слесара Софіі Сцяпанаўны Багароцкай. Праўда, расла яна здольнай і талковай дзяўчынкай. Вучылася ў пачатковай школе, а потым пашчаслівілася паступіць у рускую гімназію.

Але вось скончыць гімназію ёй так і не ўдалося. Польскія заправілы рашылі апалячыць рускіх, беларускіх і яўрэйскіх дзяцей. Вучоба была пераведзена выключна на польскую мову. Не магла змірыцца з гэтым Софія Сцяпанаўна. Кінула вучобу. А далей... Перспектыў няма. Будучага не існавала. Што рабіць, дзе выйсце? Яна рашае яшчэ зусім маладой выйсці замуж.

Але гора пасля замужжа падвоілася. Муж, як аказалася, не меў польскага подданства. Ён быў рускім. Цяпер яна перажывае ўжо не толькі за сябе, але і за свайго мужа. Яго звальняюць з работы (ён быў настаўнікам рускай мовы). Пяць год мытарствуе без работы. Софію Сцяпанаўну таксама на работу не прымаюць, бо і яна руская. Яны абодва пераносяць здзекі ад польскіх улад, ад паноў і капіталістаў. Іх ненавідзяць толькі таму, што яны не палякі і не хочуць прыняць польскую веру.

У 1927 годзе з цяжкасцю ўдалося ўстроіцца тав. Багароцкай у земаддзел у якасці машыністкі. На справе яна выконвала работу кур'ершы. Але праз некаторы час яе зноў звальняюць, матывіруючы «скарачэннем штата». Не паспелі яе зволіць, як узялі другую. Прычыны адны і тыя-ж—руская.

Годы беспрацоўя не прайшлі бясследна. Не было ніякіх магчымасцей працягнуць сваё існаванне. Хутка памёр муж. Асталася я з дзіцём, — расказвае тав. Багароцкая. — Перабіваючыся як-небудзь на сезонных работах з вялікімі цяжкасцямі выхоўвала я свайго сына.

Але разам з гэтым я выхоўвала ў сыне нянавісць да ўладарнікаў Польшчы.

Софія Сцяпанаўна шукала праўды, справядлівасці, але яна яе не магла знайсці. У яе глыбокім сэрцы расла нянавісць да памешчыкаў, капіталістаў і да ўрада, які стаяў поўнасцю на абароне інтарэсаў міраедаў. Часта яна слухала радыё з Масквы. Думала вельмі многа аб Совецкім Саюзе.

І вось цяпер з вялікай любоўю і радасцю тав. Багароцкая ўспамінае аб тым незабыўным дні, калі часці Чырвонай Арміі перайшлі граніцу і падалі брацкую руку дапамогі прыгнечаным народам Заходняй Беларусі.

— Некалькі дзён перад прыходам Чырвонай Арміі мы з сынам пайшлі да совецкай граніцы. І мелі шчасце першымі сустрэць нашых слаўных воінаў.

Адзінае жаданне тав. Багароцкай—гэта працаваць.

— Я зараз выбрана дэпутатам Народнага Сабрання. З вялікай радасцю і гонарам выканала волю народа і яго наказ. Я галасавала за совецкую ўладу ў Заходняй Беларусі і за далучэнне яе да Совецкага Саюза. Я бязмежна шчаслівa за будучае сваё і сына,—усклікае Софія Сцяпанаўна.

Тав. Багароцкая цяпер жыве новым жыццём. З прэзрэннем яна ўспамінае кашмарныя годы панавання польскіх паноў і ўсе законы, выданыя імі, таму, што яны былі накіраваны на прыгнечанне працоўных, на бясконцую траўлю адной нацыянальнасці на другую.

Узяць хоць-бы, — гаворыць тав. Багароцкая,—закон аб продажы і куплі маёмасці. Па закону польскай улады рускія і беларусы мелі права толькі прадаць маёмасць, а купляць ім забаранялася.

Трэба было бачыць, як вочы гэтай жанчыны пачынаюць зззяць радасцю, калі гаворыш аб нашых совецкіх жанчынах, аб нашых шчаслівых дзецях, аб вялікай краіне соцыялізма.

Воля народа Заходняй Беларусі выканана. Заходняя Беларусь—Совецкая. Па-новаму, па-совецкаму зажывуць працоўныя беларусы, рускія, палякі і яўрэі. Свабодна, радасна і шчасліва будзе жыць жанчына былой панскай Польшчы. На вызваленай зямлі Заходняй Беларусі пры дапамозе вялікага совецкага народа расцвіце яркім цветам культура і навука.

Яркае сонца зззяе над зямлёй Заходняй Беларусі.

Баранавічы. **Г. Каган.**

Дэпутаты Народнага Сабрання Заходняй Беларусі (злева—направа): Тарнілавіч Ольга Якаўлеўна, Малько Ольга Цітанаўна, Мамажэнец Екацерына Емельянаўна, Лейчынская Ніна Ігнацьеўна, Ананіч Соф'я Іванаўна.
Фота Казловіча.

Сара Каган

РАДАСНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Машына імчыць праз яўрэйскія мястэчкі з брудныміі крывымі вулічкамі, з поўгнілымі ганкамі, з базарам і малымі раскіданымі крамкамі. Вось яна праклятая спадчына капіталістычнага ладу, якую ты ўжо даўно паспеў забыць, і якая так жыва цяпер зноў з'явілася перад тваімі вачыма.

Усюды сустракаеш дарагіх і блізкіх людзей. Усе яны выглядаюць, як дзеці ў першы раз пасля доўгай, суровай зімы выбегшыя насустрач вясне, насустрач сонцу.

Усе яны хочуць гаварыць, пытаць, расказваць. А гаварыць ёсць аб чым. Столькі новага, радаснага вакол!

Людзі гуляюць да позняй ночы на вуліцах вызваленых гарадоў. Яны ўглядаюцца ў партрэты правадыра, кіраўнікоў урада, чытаюць лозунгі, плакаты, напісаныя на чатырох мовах: рускай, беларускай, яўрэйскай, польскай. Яны слухаюць па радыё совецкія перадачы, спяваюць совецкія песні, аглядаюць совецкія аўтамабілі, гавораць з совецкімі людзьмі, прыслухоўваюцца з найвялікшай увагай да кожнага слова аб шчаслівым і радасным жыцці ў Совецкім Саюзе.

Яны прыслухоўваюцца, і вочы іх іскрацца шчасцем: шчаслівае жыццё будзе належаць таксама і ім. Незвычайная нянавісць прабуджаецца ў іх грудзях да былога польскага ўрада, які столькі хлусні і паклёпу распаўсюджваў аб жыцці ў Совецкім Саюзе.

— Як мне не плакаць,—сказала жанчына год сорак, з бледным, змораным тварам, у старым залатаным кажушку,— калі я падумаю, што магу цяпер свабодна хадзіць па самых цэнтральных вуліцах горада, не баючыся, што мяне, як сабаку, прагоняць бізуном за тое, што я яўрэйка. Калі чуеш жудасныя расказы аб тым, якое бяспраўе і здзекі тут існавалі ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва, то садрагаешся.

У кожным горадзе былі вуліцы, дзе яўрэям было забаронена хадзіць. Палякам было забаронена купляць у яўрэяў. Два месяцы яўрэйскія студэнты, стоячы, слухалі лекцыі, выражаючы гэтым пратэст супроць варварскага закона польскага ўрада аб тым, што студэнты-яўрэі маюць права сядзець толькі на левых лавах.

3 лістапада, у часе наведвання групай дэлегатаў Заходняй Беларусі завода „Красный богатырь", адзін з дэлегатаў, член Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі Н. Л. Остасевіч, сустрэў пасля 18-гадовай разлукі сваю сястру Е. Л. Остасевіч, якая працуе начальнікам галоўнага сектара хімічнай лабараторыі завода. На здымку: Е. Л. і Н. Л. Остасевіч.

Фота Л. Велікжаніна (Фота-клішэ ТАСС)

Дорага каштаваў студэнтам іх пратэст. Сынкі польскіх паноў дзіка здзекваліся над імі за тое, што яны пасмелі пратэставаць супроць варварства.

Да мяне ў пакой увайшла жанчына гадоў 30—35. Але глыбокія маршчыны робяць яе малады твар старым. Па вопратцы і ўсяму абліччу я адразу адчула яе няшчасце.

Яна чула, што я з Мінска. Прышла даведацца што-небудзь ці можа яна цяпер марыць аб шчаслівым жыцці, якім жывуць у Совецкім Саюзе.

Пачынаецца тут такая звычайная сумная гісторыя: муж яе працаваў на фабрыцы, у 40 год памёр ад туберкулёза. Яна асталася з 5 малымі дзецьмі. Работы няма, хлеба няма. Жылі, гаворыць яна, апусціўшы галаву, як здаралася—калі елі, калі галадалі, калі зараблялі, калі выпрашвалі міласцінку. Вучыць дзяцей рамяству не мела магчымасці, грошай не было.

Калі я расказвала гэтай жанчыне, якое жыццё забяспечана жанчынам і дзецям у нас, у Совецкім Саюзе, яна слухала мяне, затаіўшы дыханне.

Вось яна, краіна цудоўных казак, дзе не пакутуюць удовы і сіроты—усклікнула яна, і слёзы градам пакаціліся з яе вачэй па бледных шчоках.

З дзяўчатамі я сустрэлася на вуліцы. Пачалася ажыўленая размова аб усім. Цяжка перадаць словамі тое здзіўленне, якое выклікалі ў іх мае расказы аб дружбе і любві ў нашай совецкай моладзі. Вось гэтыя 24—25-гадовыя дзяўчаты краўчыхі, работніцы, служачыя, якія не мелі прыданага і належнага, так званага «іхэса» («знатнага» паходжання), былі тут залічаны ў катэгорыю «прэстарэлых дзеў», г. зн. прапашчых. У нашай моладзі такія рэчы несумненна выклікаюць смех. Але трэба бачыць гэтых людзей, гаварыць з імі, каб зразумець усю трагедыю, якая тоіцца ў гэтым. Яны ніяк не могуць уявіць сабе краіны без прыданага, без сватоў, без прастытуцыі.

Выязджаючы з Заходняй Беларусі, адчуваеш ўпэўненасць, што недалёка той час, калі ты тут больш не сустрэнеш стомленых беспрацоўем людзей, не сустрэнеш на рагу галодных, абарваных дзяцей.

— Да пабачэння, дарагія таварышы, цяпер мы будзем часта сустракацца на радасцях.

Падзяка ад шчырага сэрца

Нядаўна ўвесь совецкі народ святкаваў XXII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Упершыню за ўсё сваё жыццё гэта свята святкавалі і мы—працоўныя Заходняй Беларусі, вызваленыя роднай Чырвонай Арміяй з-пад гнёту польскіх паноў-крывяпіўцаў. Якое шчасце адчуваць сябе свабодным чалавекам пасля столькіх год гнёту і жудасці!

У гэтыя радасныя дні мне хочацца расказаць аб сваім мінулым жыцці. Хочацца, каб вы, дарагія жанчыны Совецкага Саюза, ведалі якім бесчалавечным было наша жыццё ў былой панскай Польшчы. 23 чэрвеня 1929 года—памятны для мяне дзень. У 4 гадзіны раніцы ў нашу хату ўварвалася 6 паліцэйскіх (5 з іх былі апрануты ў штацкае адзенне). Яны скамандавалі «рукі ўгору» і павялі ў Слонім, у дэфензіву. Жылі мы тады ў 20 кілометрах ад Слоніма. Разам са мной арыштавалі бацьку і брата. Праз некаторы час я даведалася, што і другі брат, які быў узят на ваенную службу, таксама быў арыштаван.

Цяжка апісаць, якім катаванням падвяргалі нас у польскай турме. Калі мяне прывялі да следчага, ён заявіў: «Яе трэба расстраляць, а не трымаць у турме». У мяне хацелі выпытаць аб настроях у вёсцы. І калі адказы не падабаліся катам, яны пачыналі збіваць.—Біце як след, не гледзячы, што жанчына, яна—большэвічка,—гаварыў камендант.

Пасля выхаду з турмы я была беспрацоўнай. Ніхто не прымаў на работу: Калі наймалася ў прыслугі, прыходзіла паліцыя да гаспадара і гаварыла: «Праганіце яе, яна ненадзейная».

Перад германа-польскай вайной я паўтары месяцы прахварэла тыфам, а потым—зноў турма. Нарэшце надышоў радасны дзень, якога мы чакалі на працягу дваццаці год. 18 верасня Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія Вялікага Совецкага Саюза вызваліла нас ад гнёту, катаванняў і варварства панскай Польшчы.

Цяпер я свабодная! Працую ў сакратарыяце часовага ўпраўлення. Да нас прыходзіць многа наведвальнікаў. Сярод іх ёсць і тыя, якія не хацелі мяне ўзяць нават судамойкай. Ад усёй душы горача дзякую дарагіх чырвонаармейцаў і камандзіраў Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі за наша вызваленне. Самая большая падзяка роднаму і мудраму таварышу Сталіну!

Еўгенія Міхайлаўна Кароль.

г. Слонім.

Работніцы тэкстыльнай фабрыкі г. Беластока (Заходняя Беларусь) рыхтуюць да адкрыцця першы чырвоны куток.

Фота Д. Чарнова (Фота-кліша ТАСС)

Я, СТАРАЯ, НІБЫ ПАМАЛАДЗЕЛА

Мне 80 год, але ў сваім жыцці я не ведала ні гадзіны спакою і радасці. Хлеб з маім старым Васілём зараблялі ў памешчыкаў, а батрацкі хлеб—вельмі горкі.

З вялікімі цяжкасцямі набылі мы паўтары дзесяціны зямлі, але жыццё лепшым не стала. Да цяжкай працы дабавіліся падаткі і даўгі за зямлю.

Так жыла я, так жыла і мая прыяцелька Кульбінская Алёна з сынам Уладзімірам. Нават яшчэ горшай была яе доля. Звярнуўшыся пасля вайны, яны не знайшлі сваёй хаткі—яна згарэла. Уладзімір пасвіў жывёлу, матка працавала на паноў, і толькі 15 год, як набылі яны сабе хацінку-гнілушку, крыху падрамантавалі яе, і так жылі ўвесь век, слязьмі амываючыся.

І вось радасць асвятліла наш гаротны шлях. Да нас прышла Чырвоная Армія і вызваліла нас з-пад панскага гнёта. У вёсках зямлю памешчыкаў раздалі сялянам. Сына Алёны Уладзіміра Кульбінскага, вечнага пастуха выбралі дэпутатам Народнага Сабрання.

І я, старая, нібы памаладзела. У часе выбараў я аддала свой голас за сына батрачкі Алёны—Уладзіміра Кульбінскага і дала яму наказ.

— Уладзік, мы—гаротныя сяляне-беднякі—даверылі табе вырашыць наш лёс. Дык ведай-жа, што ў Народным Сабранні Заходняй Беларусі ты павінен галасаваць за совецкую ўладу, за нашу лепшую долю.

Агафья Герасімчук.

в. Гознае,
Заблудоўскай воласці.

Лепшы агітатар станкабудаўнічага завода імені К. Е. Варашылава загадчык гаражом А. Г. Башкірцэў планава праводзіць гутаркі з хатнімі гаспадынямі дома № 25 па вуліцы імені Валадарскага.
На здымку: Тав. Башкірцэў гутарыць з хатнімі гаспадынямі аб прадстаячых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных БССР. Фота Е. Халдэя (Фотахроніка БЕЛТА).

Вывучаем выбарчы закон

Надыходзяць выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Гэтая вялікая, усенародная палітычная справа патрабуе велізарнай арганізацыйнай, масава-агітацыйнай і прапагандысцкай работы. Мы, хатнія гаспадыні, не павінны аставацца ў баку ад гэтай важнай справы. Ад нас патрабуецца вялікая дапамога агітатарам.

У нашым доме № 35 па Комсамольскай вуліцы арганізавана 6 гурткоў па вывучэнню Палажэння аб выбарах. Першыя дні не ўсе жанчыны наведвалі заняткі. Яны знаходзілі розныя прычыны—дома работы многа, няма на каго дзяцей пакінуць і т. д. Я, як член домаўпраўлення, разам з агітатарам зайшлі на кватэры, пагутарылі з кожнай жанчынай паасобку і дапамаглі ім правільна арганізаваць унутраны распарадак. Цяпер яны спраўляюцца і з хатнімі работамі, знаходзяць час пачытаць газету, кнігу і своечасова прыходзяць на заняткі.

Жанчын, не прымаўшых удзел у грамадскай рабоце, мы пачалі паступова ўцягваць у актыў. Вось, к прыкладу, хатняя гаспадыня Баркавец ніколі не хадзіла на сходы і рэдка наведвала заняткі. Мы выбралі яе старастай гуртка. Цяпер яна стала самай актыўнай жанчынай.

У нашым доме мы маем вялікі актыў жанчын. Усе яны рэгулярна наведваюць заняткі. З глыбокім інтарэсам вывучаюць Палажэнне аб выбарах. Уважліва слухаюць аб'ясненні агітатара і задаюць пытанні. У кожным гуртку ёсць староста, які вядзе спіс наведвання і абвяшчае аб дні заняткаў. Самыя актыўныя жанчыны ў нас Эліневіч, Сухадольская, Дварэцкая.

Адначасова я з'яўляюся начальнікам групы самаабароны. Увесь час займалася з хатнімі гаспадынямі па вывучэнню правіл проціпаветранай і хімічнай абароны. Больш 20 жанчын і 3 піонеры—сувязісты з нашай групы—здалі нормы на значок проціпаветранай хімічнай абароны. За актыўны ўдзел у абаронна-масавай рабоце рашэннем оргбюро Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма БССР па Мінскай вобласці я ўзнагароджана нагрудным знакам «Актывіст». Чатыры жанчыны з нашай групы райсоветам Асоавіяхіма прэміраваны, з іх 3 жанчыны атрымалі граматы.

Каля 70 хатніх гаспадынь нашага дома жывуць у новым трохпавярховым каменным доме, у светлых, цёплых, утульных кватэрах з усімі выгодамі.

Толькі дзякуючы партыі і ўраду мы жывем у добрых умовах. Таму ўсе нашы хатнія гаспадыні ў часе выбараў будуць галасаваць толькі за тых людзей, якія клапоцяцца аб выбаршчыках, якія змагаюцца за інтарэсы народа, за інтарэсы нашай радзімы. Мы яшчэ раз прадэманструем сілу, магутнасць і непераможнасць сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Софія Фёдараўна Лонская,
хатняя гаспадыня.
Мінск.

АГІТАТАР АРОНАВА

Яркае святло падала на стол, сцены невялікага, але чыстага і ўтульнага пакоя. На сценах— партрэты і плакаты, на вокнах гардзіны. Рыва Ефімаўна заводзіць патэфон. Новыя песні шчасця і радасці слухаюць хатнія гаспадыні, якія прышлі на заняткі гуртка па вывучэнню Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Іх сабралася 15 чалавек. Гэта пераважна пажылыя жанчыны— хатнія гаспадыні. Рыва Ефімаўна закрывае патэфон, правярае па спісу ці ўсе сабраліся, зачытвае тэму заняткаў і пачынае гутарку.

Павольна, без спешкі простымі і зразумелымі словамі агітатар першыя 15 мінут гаворыць пра навіны з газет, потым пераходзіць да вывучэння выбарчага закона.

— Сёння мы заканчваем вывучэнне выбарчага закона,—гаворыць тав. Аронава. Астаўся апошні раздзел. А зараз пачнем прапрацоўваць раздзел «Дзень выбараў».

Пры гэтым Рыва Ефімаўна зачытвае Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбарчай кампаніі і дні выбараў, а потым прапрацоўваюць 9 раздзел Палажэння аб выбарах. На кожным артыкуле спыняюцца. Агітатар зачытвае яго, аб'ясняе сваімі словамі, а потым пытаецца ў слухачоў, як яны зразумелі.

Ітак, артыкул за артыкулам. Найбольшую колькасць пытанняў задавалі жанчыны, калі прапрацоўвалі дзесяты раздзел «Парадак галасавання». На кожнае пытанне выбаршчыкаў агітатар давала поўныя і дакладныя адказы.

Рыва Ефімаўна на заняткі гуртка заўсёды прыходзіць падрыхтаванай. Па кожнай тэме складае канспект. Выбаршчыкі ўважліва слухаюць яе, задаюць многа пытанняў і астаюцца задаволенымі кожнымі заняткамі.

Многа правяла заняткаў за гэты перыяд тав. Аронава. Рыхтуючыся да заняткаў, яна скарыстоўвае дапаможны матэрыял з газет і журналаў. Складае план гутаркі. Вось хутка ўжо будуць праходзіць трэція выбары, як яна на гэтым-жа ўчастку і з гэтымі-ж хатнімі гаспадынямі працуе агітатарам. Яе паважаюць, любяць за добрую работу, за ўважлівы і ўмелы падыход да кожнага паасобку, за ветлівасць, за простую і зразумелую мову. Свайму агітатару слухачы расказваюць аб усім— аб мінулым жыцці і аб сучасным, аб быту і сямейных справах.

Асаблівую актыўнасць праяўляюць у рабоце гуртка хатнія гаспадыні Папова, Маша Зісман, Бася Мількіна і інш. Аб кожных занятках гуртка відаць у дзённіку Рывы Ефімаўны. Тут яна кожны раз запісвае колькасць прысутнічаўшых, пытанні, якія задаюць ёй на занятках. А пытанняў вельмі многа.

Сярод усіх гурткоў гарадскога пасёлка Крупкі гурток тав. Аронавай, які знаходзіцца на вуліцы імені Леніна, з'яўляецца адным з лепшых.

А. Дзімітрыеў.

Крупкі

Весела святкавалі калгаснікі калгаса „Адраджэнне", Мінскага раёна, 22 гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.
На здымку: у калгасным клубе на вечары, прысвечаным святкаванню.
Фота І. С. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

ЗАСЛУЖАНЫ АЎТАРЫТЭТ

Сярод выбаршчыкаў калгаса «Чырвоная Беларусь» асаблівым аўтарытэтам карыстаецца малады агітатар, комсамолка Ганна Сталярова. На заняткі яна прыходзіць добра падрыхтаванай. Свой матэрыял заўсёды насычае многімі фактамі, цікавымі заметкамі з газет і журналаў.

Апрача прапрацоўкі матэрыялаў аб выбарах у мясцовыя Советы і Канстытуцыі тав. Сталярова знаёміць слухачоў з многімі пытаннямі бягучай палітыкі. Расказвае ім пра соцыялістычную гаспадарку нашай краіны. Расказвае аб міжнародным становішчы.

Ганна Сталярова простай мовай і зразумела расказвае калгаснікам пра мудрую Сталінскую Канстытуцыю, пра ўсе законы, па якіх вялікі совецкі народ будуе сваё прыгожае і шчаслівае жыццё.

Малады агітатар тав. Сталярова прапрацавала са сваімі слухачамі даклад таварыша Сталіна, рашэнні гістарычнага XVIII партыйнага з'езда. Сама тав. Сталярова многа працуе над павышэннем свайго палітычнага ўзроўню. Вывучаючы гісторыю партыі, яна карыстаецца творамі Леніна і Сталіна. Многа чытае мастацкай літаратуры.

Тав. Сталярова заслужана карыстаецца аўтарытэтам сярод калгаснікаў «Чырвоная Беларусь» Доўскага сельсовета. Яна з'яўляецца адным з лепшых агітатараў у раёне.

Ал. Казырновіч.

Журавіцкі раён.

Ад работніцы да дырэктара фабрыкі

Прасторныя, светлыя, утульныя цэхі швейнай фабрыкі «8 сакавіка». Дружна шумяць маторы машын. Спрытныя рукі работніц даюць чоткі напрамак кожнай строчцы. На суседніх сталах растуць велізарныя грудy гатовай прадукцыі. Работніцы, майстры сваёй справы з кожным днём павышаюць нормы выпрацоўкі, даюць сацыялістычнай радзіме прадукцыю высокай якасці. Дырэктарам гэтай фабрыкі працуе былая работніца швейнай фабрыкі «Кастрычнік» Александра Александраўна Зеленко.

Толькі ў 1929 годзе Александра Александраўна малапісьменнай паступіла працаваць на фабрыку «Кастрычнік» у горадзе Мінску. Спачатку яна працавала работніцай другога разрада. З цягам часу яна асвайвала тэхніку швейнай вытворчасці, працавала чэсна, аддана. І неўзабаве яе перавялі на 7 разрад.

Незабыўным і радасным для тав. Зеленко быў дзень, калі яе прынялі ў партыю. Яшчэ з большай энергіяй і адданасцю пачала яна працаваць. Прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. У часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР тав. Зеленко працавала даверанай на выбарчым участку, а ў часе выбараў у Вярхоўны Совет БССР была членам акруговай выбарчай камісіі. Яна з'яўляецца членам Мінскага абкома партыі. Тав. Зеленко ўмела спалучае сваю вытворчую работу з грамадскай і вучобай у вячэрнім Комвузе. За выкананне вытворчых планаў яе прэміравалі.

Калі я прыступіла да выканання абавязкаў дырэктара фабрыкі,—гаворыць тав. Зеленко,—перш за ўсё прынялася за дасканалае вывучэнне людзей прадпрыемства, яго кіруючага састава, за штодзённае і ўпорнае аўладанне тэхнікай вытворчасці. Паступова авалодвала большэвіцкім стылем кіраўніцтва прадпрыемствам.

За ўважлівыя і чулыя адносіны да рабочых і работніц тав. Зеленко карыстаецца заслужанай сімпатыяй з боку калектыва фабрыкі.

Біяграфія і работа тав. Зеленко—цудоўны ўзор таго, як партыя большэвікоў любоўна вырошчвае людзей і высока паднімае іх. Яна вялікую ўвагу ўдзяляе таксама выхаванню кадраў.

За годы сталінскіх пяцігодак на прадпрыемстве выраслі выдатныя людзі—гераіні соцыялістычнай працы.

Радавыя работніцы ад станка сталі майстрамі лент, майстрамі змен, начальнікамі цэхаў. Работніца Марыя Кабернік вылучана майстрам ленты. Яе брыгада сістэматычна перавыконвае нормы на 110—120 процантаў. Былая работніца-комсамолка Грамовіч цяпер працуе майстрам цэха школьнага асартымента. Норму выконвае на 120 процантаў. Яе брыгада ў першым паўгоддзі 1939 года дабілася выканання плана па школьнаму асартыменту на 140,4 процанта.

Нядаўна вылучана майстрам цэха работніца Зайдзінкноп. Цэх, у якім яна працуе, перавыконвае нормы на 120 процантаў. Выдатных поспехаў у рабоце дабілася работніца-вылучэнка Мілентовіч, якая цяпер працуе начальнікам цэха. За стаханаўскую работу цэх к Першаму мая атрымаў пераходны фабрычны сцяг. А тав. Мілентовіч атрымала ад дырэкцыі фабрыкі грашовую прэмію.

На фабрыцы шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі, цэхамі і паасобнымі работніцамі за лепшую якасць і большую колькасць прадукцыі. Кожная работніца, кожны цэх і брыгада імкнуцца заняць першае месца ў перадкастрычніцкім спаборніцтве, у спаборніцтве з швейнай фабрыкай імені Крупскай.

Дзякуючы стаханаўскай рабоце калектыў фабрыкі дабіўся выдатных рэзультатаў. Дзевяцімесячны вытворчы план рабочы калектыў выканаў 22 верасня. Фабрыка з'яўляецца адным з перадавых прадпрыемстваў Мінска.

Словы большэвіцкай праўды нясуць у масы лепшыя стаханаўкі фабрыкі—Элька Берзон, Таня Мельнік, Фіра Кагановіч. Яны з'яўляюцца агітатарамі сярод хатніх гаспадынь на выбарчых участках.

Непазнавальна вырас добрабыт працоўных жанчын. Для работніц краіны квітнеючага соцыялізма пабудаваны дамы адпачынку, санаторыі, курорты. Партыя і ўрад клапоцяцца штодзённа аб іх здароўі. Толькі за гэта лета ў дамах адпачынку, санаторыях і на курортах адпачывала 120 чалавек з фабрыкі «8 сакавіка». Вось якім багатым і поўнакроўным з'яўляецца жыццё совецкай жанчыны пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Мінск. **А. Фёдарава.**

Стаханаўкі швейнай фабрыкі „Кастрычнік" (гор. Мінск), якія перайшлі працаваць на вядучыя аперацыі (злева—направа): Вера Шаўлюкевіч, Алімпіяда Недзелька і Марыя Хоменок.
Фота В. Баранава (Фотахроніка БЕЛТА).

ПАРАДЫ ЎРАЧА

Дыфтэрыя і барацьба з ёю

Дыфтэрыя—сур'ёзная і небяспечная заразлівая хвароба, якая паражае дзяцей, часцей за ўсё ва ўзросце ад 1 года да 8 год.

Найбольшая колькасць захворванняў дыфтэрыяй наглядаецца ўвосені, зімой і ранняй вясной.

Захворванні дыфтэрыяй выклікаюць драбненькія, нябачаныя простым вокам жывыя істоты—мікробы, маючыя выгляд палачкі. Пры заражэнні дыфтэрыяй гэтыя мікробы пападаюць у арганізм дзіцяці праз нос або рот. У целе мікробы размнажаюцца і выдзяляюць вельмі моцныя атруты. Дзіця заражаецца і захворвае.

Захворванне атрымліваецца не адразу. Праходзіць некаторы час пакуль мікробы размнажаюцца ў арганізме і пачне дзейнічаць атрута дыфтэрыйных мікробаў. У гэты час дзіця па выгляду зусім здаровае. Гэта—адкрыты перыяд хваробы.

Праз 2—7 дзён пасля таго, як мікробы папалі ў арганізм дзіцяці, зеў, дзе часцей за ўсё змяшчаюцца мікробы, робіцца чырвоным. На ім паяўляецца шэраватa-белы налёт. Апухаюць шыйныя залозы. Дзіця пачынае скардзіцца на боль у горле і цяжкасць пры глытанні ежы. Адначасова ў яго паяўляецца тэмпература, галаўная боль, агульнае недамаганне.

Часта мікробы дыфтэрыі, папаўшы з зева або носа ў дыхальнае горла, выклікаюць тут плёнкі, якія перашкаджаюць дыхаць. Гэта ёсць так званы круп—надзвычай небяспечнае захворванне. Калі своечасова даставіць такога хворага да ўрача, то яго яшчэ можна выратаваць.

Каб абясшкодзіць дзейнасць дыфтэрыйнай атруты, захварэўшаму неабходна даць процідыфтэрыйную сываратку супроць дыфтэрыі.

Чым раней увесці захварэўшаму дзіцяці сываратку, тым больш надзей выратаваць яго ад смерці і цяжкіх ускладненняў.

Галоўнай крыніцай пашырэння дыфтэрыі з'яўляецца хворае на дыфтэрыт дзіця. Усе выдзяленні ў яго з рота і носа: макрота, сліна, слізь маюць у сабе дыфтэрыйныя мікробы. Пры размове, кашлі, чыханні гэтыя мікробы разам з кропелькамі сліны, макроты або слізі пападаюць у паветра і адтуль у арганізм здаровых дзяцей, якія такім чынам заражаюцца.

Хворы з'яўляецца заразным не толькі ў часе хваробы, але і на працягу некаторага часу (некалькіх дзён, тыдняў, а часта і месяцаў) пасля выздараўлення, бо дыфтэрыйныя мікробы на гэты час астаюцца ў яго зеве або носе.

Вельмі часта заражэнне адбываецца праз прадметы (бялізну, пасуду, цацкі і т. д.), якія былі ў карыстанні хворых дыфтэрыяй. Мікробы могуць папасці і на сцены, і на падлогу, і ва ўсе куткі. У цёмных, пыльных кутках на дробных цацках мікробы могуць захоўвацца даволі доўга.

Заразіцца дыфтэрыяй можна таксама ад людзей, якія сутыкаюцца з дыфтэрыйнымі хворымі. Так, напрыклад, маці, якая даглядае хворае дзіця, можа перанесці заразу іншым дзецям.

Якія меры трэба прыняць, каб аказаць захварэўшаму своечасовую дапамогу?

Як толькі ў дзіцяці захворвае горла і павышаецца тэмпература трэба зараз-жа выклікаць урача. Нельга весці дзіця ў амбулаторыю. Гэта шкодна для яго і небяспечна для дзяцей, з якімі ён сустрэнецца ў дарозе або ў амбулаторыі.

Калі ўрач устанавіў захворванне дыфтэрыяй, трэба па яго ўказанню адправіць дзіця ў бальніцу. Там яно атрымае неабходнае лячэнне і добры догляд. Дзіця, у якога баліць горла, трэба па магчымасці аддзяліць ад дзяцей яшчэ да прыходу ўрача. Да хворага нельга дапускаць дзяцей. Рэчы хворага нельга даваць дзецям. Хвораму даецца асобная пасуда.

Даглядаць за хворым да яго адпраўлення ў бальніцу павінен адзін чалавек, які ні ў якім выпадку не павінен падыходзіць да іншых дзяцей і тым больш рыхтаваць для іх ежу, інакш ён можа іх заразіць дыфтэрыяй. Ён павінен добра мыць рукі з мылам пасля кожнага сутыкнення з хворым або яго рэчамі.

Пасля таго, як хворага накіравалі ў бальніцу, неабходна абеззаразіць (прадэзінфіцыраваць) пакой, дзе ён ляжаў, і рэчы, на якія маглі папасці мікробы. Пасля дэзінфекцыі неабходна ўважліва прыбраць пакой, пракіпяціць у вадзе пасуду, якой карыстаўся хворы. Цацкі, якія нельга прадэзінфіцыраваць, трэба спаліць.

Аб захворванні дыфтэрыяй бацькі павінны зараз-жа паведаміць яслі, дзіцячы сад або школу, якія наведвала іх дзіця. Тады ўрач гэтай установы прыме меры супроць пашырэння дыфтэрыі сярод іншых дзяцей.

Супроць дыфтэрыі цяпер ёсць добры, верны сродак. Гэта—супроцьдыфтэрыйная прышчэпка. Пад дзеяннем прышчэпак у арганізме дзіцяці вырабляюцца процідыфтэрыйныя целы.

Прышчэпка робіцца тры разы: другая прышчэпка робіцца праз 3 тыдні, трэцяя—праз поўгода або год.

Прышчэпкі лёгка пераносяцца, і дзіця, якому зроблена прышчэпка, амаль ніколі не захворвае дыфтэрыяй, або хваробу пераносіць вельмі лёгка.

Неабходна, каб усім нашым дзецям ва ўзросце да 8 год былі зроблены прышчэпкі супроць дыфтэрыі. Лепш за ўсё прышчэпкі рабіць маленькім дзецям—у канцы першага года жыцця, бо дзеці малодшага ўзросту найбольш успрыймальны да дыфтэрыйнай заразы.

Агульнымі намаганнямі ўсіх працоўных і органаў аховы здароўя ліквідуем захворванні дыфтэрыяй у нашай краіне.

Урач Е. С. Северын.

Адказны рэдактар В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, 1 паверх.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 1124. Тыраж 12.800 экз. Уп. Галоўлітаў СССР № 642.
Здана ў друк. 10/XI—39 г. Падпісана да друку 23/XI—39 г. У цумары 2½ друк. арк. 120×90 друк. знак.

Инв. 1953 г. БА 663

0,150

СТРАХАВАННЕ дамашняй маёмасці



ОРГАНЫ ДЗЯРЖСТРАХА ПРЫМАЮЦЬ ДАБРАВОЛЬНАЕ СТРАХАВАННЕ ДАМАШНЯЙ МАЁМАСЦІ ва ўсіх ГАРАДСКІХ і СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ БССР.

ДАМАШНЯЯ МАЁМАСЦЬ МОЖА БЫЦЬ ЗАСТРАХАВАНА НА ЛЮБУЮ СУМУ Ў МЕЖАХ ЯЕ САПРАЎДНАГА КОШТУ.

ПЛАЦЯЖЫ ЎПЛАЧВАЮЦЦА З КОЖНАЙ 1000 РУБЛЁЎ СТРАХАВОЙ СУМЫ Ў ГОД:

а) У ГАРАДСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ АД 1 РУБ. ДА 4 РУБ.,

б) У СЕЛЬСКІХ РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ АД 2 Р. ДА 8 РУБ.,

в) І Ў СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ АД 4 РУБ. ДА 9 РУБ.—

У ЗАЛЕЖНАСЦІ АД АГНЕТРЫВАЛАСЦІ БУДЫНКА.

ДЛЯ ЗАСТРАХАВАННЯ МАЁМАСЦІ ЗВЯРТАЙЦЕСЯ Ў СТРАХАВЫЯ ІНСПЕКЦЫІ АБО ДА СТРАХАВЫХ АГЕНТАЎ.

Упраўленне Дзяржстраху БССР